процессом требует наличия механизма приобретения и трансляции знаний (в том числе и гендерных) на всех уровнях системы управления воспитанием школьников. Ведущая роль в этом, как подтверждают результаты полученных нами диагностических данных, отведена системе повышения квалификации.

**А.В.Калашнікава,** *выкладчык*

# ІНТЭРНЕТ-АДРАСЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВЫХ ПРАГРАМ

Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ўсё глыбей пранікаюць ва ўсе сферы сацыякультурнай дзейнасці. Культурна-адпачынкавая дзейнасць не з'яўляецца выключэннем. Яна звязана з пошукам і перапрацоўкай разнастайнай інфармацыі, неабходнай для стварэння актуальнага і відовішчнага мерапрыемства. Таму пачнем са звароту да тых інтэрнет-адрасоў, якія дапамогуць стваральнікам культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў, рэжысёрам, менеджэрам, кіраўнікам творчых калектываў, асабліва ў аддаленых рэгіёнах краіны, студэнтам і культарганізатарам напачатку іх цікавай дзейнасці, якая пастаянна патрабуе новага вопыту.

Першае, з чым сутыкаецца кожны чалавек, калі рыхтуецца да свята, гэта, як яго арганізаваць, як падрыхтаваць сцэнарый. Стварэнне сцэнарыя патрабуе пэўных здольнасцей і інфармацыі на розныя тэмы. Гатовыя сцэнарныя распрацоўкі розных свят можна знайсці на сайце: www.massovik.ru ці http://www.xbb.uncts.ru /prazdnik/ab.html.

Бытавыя святы таксама заўсёды знаходзяцца ў полі зроку культарганізатараў. Вяселле ў горадзе ці на вёсцы – значная з'ява для вялікага кола людзей. Практычна ўсё пра вяселле, ад яго мінулых абрадавых да сучасных формаў, можна даведацца па адрасе: www.wedding.ru. На ўказаным сайце падрабязна расказваецца аб вясельных абрадах і звычаях, але няма ніводнага слова,

што гаворыцца за сталом у дадзеным выпадку. Выправіць гэта можна, калі наведаць сайт www.toast.ru/svadba, дзе прапануецца збор тостаў і віншаванняў.

Цудоўным момантам маладзёжнага вяселля можа стаць уручэнне жаніху і нявесце сертыфіката віртуальнага шлюбу (http//married8k.com). На web-старонцы «Эдем» (www.edem.ru) можна знайсці звесткі пра каталогі, агенцтвы, рэстараны і іншае, што мае дачыненне да вяселля.

Цікавую і карысную інфармацыю можна атрымаць з рускага каталога ў раздзеле «Культура» ці з web-старонкі «Созвездие интернет» http//www.stars.ru, а таксама з іншых пошукавых сістэм: http://webcrawler.com, http://www.excite.com, http://www.altavista.com, http://yahoo.com.

Пры падборы музычнай інфармацыі добра звяртацца да «Коллекции отличной музыки» http://www.urbannet.ru/~tavr, якая змяшчае музыку, тэксты і песні папулярных выканаўцаў і груп. Сур'ёзную музыку і звесткі можна знайсці на www. cwronews.net.

Дэкарацыі, сцэнічныя эфекты, канцэптуальнае вырашэнне ігравой пляцоўкі – важныя элементы культурна-адпачынкавай дзейнасці. Як пры мінімуме выразных і тэхнічных сродкаў дасягнуць максімуму адпаведнага эфекту, падкажа наватарскі погляд дызайнераў на звычайныя рэчы на сайце www.institutdesign.com.

Магчыма, пастановачныя рашэнні рэжысёрам культурна-адпачынкавай дзейнасці падкажуць звесткі са знакамітых тэатральных фестываляў: www.fetstival.-avenion (Авіньёнскі фестываль), www.greekfestival.gr (фестываль у Грэцыі) і інш.

Названыя сайты – толькі малая частка таго, што адчыняе новыя далягляды творцам. Але нават яны дазваляюць пастаянна сачыць за навінамі, быць уключаным у зменлівае асяроддзе часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ